# Комсамолу Беларусі 25 год

* * *

**К. Т. МАЗУРАЎ,**
сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі.

24 верасня спаўняецца 25 год з дня афармлення комуністычных арганізацый моладзі Беларусі ў адзіную арганізацыю — Комуністычны Саюз Моладзі Беларусі.

Створаны комуністычнай партыяй большэвікоў Беларусі, комсамол Беларусі за 25 год прайшоў вялікую школу большэвіцкага выхавання. Выхаваныя ў духу адданасці соцыялістычнай Радзіме і таварышу Сталіну, комсамольцы Беларусі пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў са зброяй у руках змагаліся за перамогу ў Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі, актыўна ўдзельнічалі ў стварэнні Беларускай Совецкай дзяржавы, у соцыялістычным будаўніцтве, у комуністычным выхаванні дзяцей. На працягу ўсіх год свайго існавання комсамол Беларусі быў баявым рэзервам і памочнікам КП(б) Беларусі ў яе велізарнай рабоце па будаўніцтву соцыялізма ў нашай краіне.

Адной з самых яркіх старонак гісторыі комсамола Беларусі з'яўляецца яго дзейнасць у перыяд вялікай Айчыннай вайны. Па закліку комуністычнай партыі і таварыша Сталіна комсамол Беларусі падняўся на свяшчэнную вайну супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, павёў за сабой дзесяткі тысяч юнакоў і дзяўчат Беларусі.

З першых дзён Айчыннай вайны палова асабовага састава комсамола нашай рэспублікі ўступіла ў рады Чырвонай Арміі. Комсамольцы і моладзь, застаўшыеся ў тылу ворага, здольныя насіць зброю, аб'ядналіся ў партызанскія атрады, у падпольныя баявыя арганізацыі, арганізоўвалі дыверсіі ў варожым тылу, знішчалі нямецкія эшалоны, аўтамашыны, баявую тэхніку і жывую сілу акупантаў. Комсамольцы былі лепшымі байцамі партызанскіх атрадаў. Яны ўдзельнічалі ў самых смелых і рызыкоўных аперацыях супроць захопнікаў. Комсамольцы былі ініцыятарамі ў арганізацыі масавага руху знішчальнікаў-паляўнічых па знішчэнню гітлераўскіх адміністратараў і правакатараў, у вялікай рабоце па баявому абучэнню моладзі партызанскіх атрадаў.

Працаваўшыя пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый, комсамольскія арганізацыі партызанскіх атрадаў, маладыя падпольшчыкі гарадоў і сёл Беларусі праводзілі вялікую палітычную работу сярод насельніцтва. Тысячы комсамольцаў-агітатараў разам з комуністамі бясстрашна пранікалі ў гарады і вёскі, распаўсюджвалі газеты і лістоўкі, праводзілі гутаркі аб герайчнай барацьбе і перамогах Чырвонай Арміі

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы